# Загадкі

# Загадкі

## I. Гародніна, садавіна, ягады, расліны, дрэвы

**1.**

У зямлю схаваўшы нос,
Пані вырастае.
Толькі пук зялёных кос
Вецер развявае.

**2.**

Прысеў пад плотам
Рыжы кот,
Павесіў доўгі хвост
На плот.

**3.**

На градцы ўлетку
Вырасла паненка:
Круглявы твар,
Ружовая сукенка.

**4.**

Летам я – рагатая,
Восенню – хвастатая.
Хоць і горкая зусім,
Ды патрэбная – усім.

**5.**

З яе цудоўныя салаты
Прыгатаваць мы вельмі
рады.
Хоць злая, горкая, але
Хай будзе часта на стале.

**6.**

Славен край наш ёй здаўна,
Трыста розных страў – яна.
На стале любой парой
Нам – жаданай смакатой.

**7.**

Выраслі наградцы
Сакаўныя братцы:
Доўгія, шурпатыя,
Вітамінаў шмат у іх.

**8.**

Круглы ён, але не мячык.
Ёсць нага, але не скача.
Шмат лістоў, але не
сшытак,
Апрануў паўсотні світак.

**9.**

У бочачцы чырвонай
Рубінаў поўным-поўна.

Ірдзеюць, сакавітыя,
Святлом зары налітыя.

**10.**

На лазе паспеў на поўдні,
Сокам сонечным напоўнен.

**11.**

У зялёным кажусе
Вырас круглаваты.
І яму заўсёды ўсе
Пакланіцца рады.
Станеш есці – ён ружовы,
Сакавіты і цукровы.

**12.**

На балоце лясным
Між куп'я агніста
Сонейкам жывым
Зіхацяць маністы.

**13.**

Жоўтае мора ля вёскі
Ціха шапоча, шуміць.
Сіняе вочка валошкі
Светла навокал глядзіць.

**14.**

За дарогаю на полі

Прыгажун сцяной стаіць.
Стройны, сонечны, вясёлы,
Завушніцамі звініць.

**15.**

Выспеў каля хаты –
Нізкі і вусаты.
Як сажнём, наробім круп,
То згатуем смачны суп.

**16.**

Жаданы госць яна заўсёды
На палетках нашых.
Зацвіце – адорыць мёдам.
Адцвіце – блінамі, кашай.

**17.**

Сінявокі, слаўны, чысты.
Галавасты, залацісты.
Дасць абноў ён людзям
шмат,
Будзе кожны вельмі рад.

**18.**

На сцяблінку сонца села,
Белы капялюш надзела.
У траве ўсміхаецца,
Дзеткам падабаецца.

**19.**

Я на сонейка падобны,
Мой ласунак – чорны,
дробны…
Не тады, калі свячуся,
А як згасну і сагнуся.

**20.**

Жоўтым колерам цвіце,
Радуе ўсім вока.
Адцвіце – птушынак рой
Паляціць далёка.

**21.**

Хвалюе водарам, красою,
Але не проста ўзяць рукою.
Галава – пахучая.
Тулава – калючае.

**22.**

На снезе пушыстым
Царыца стаіць.
У гронках агністых
Ззяе, гарыць.

**23.**

Вечна – беланогая,
А сукенку ўсё мяняе:
То яна зялёная,

То чырвона-залатая.
А зімовым ясным днём
Адлівае серабром.

**24.**

Белыя берэцікі,
Залатыя тварыкі.
Іх між траў прыкмеціце –
Ззяюць, як ліхтарыкі.

**25.**

У лесе зялёнай стаяла.
У хаце агністаю стала.
І кліча нас на Новы год
У вясёлы карагод.

## Адгадкі

1. Морква. 2.Гарбуз. 3.Радыска. 4.Цыбуля.
5.Рэдзька. 6.Бульба. 7.Агуркі. 8.Качан капусты.
9.Гранат. 10.Вінаград. 11.Кавун. 12.Журавіны.
13.Жыта. 14.Авёс. 15. Ячмень. 16.Грэчка. 17.Лён.
18.Рамонак. 19.Сланечнік. 20.Дзьмухавец.
21.Ружа. 22.Рабіна. 23.Бяроза. 24.Рамонкі. 25.Ёлка.

## II. Жывёлы, птушкі, насякомыя, рыбы

**1.**

Вельмі дужы, працавіты,
Ён прыгожы, самавіты.
Возіць сена, возіць дровы,
Плуг цягаць штодня
гатовы.

**2.**

Восень ці лета,
Зіма, ці вясна –
Ніколі кажух
Не здымае яна.

**3.**

Вы знаёмы
З гэткім зверам? –
На ілбе ў яго
Два дрэвы.

**4.**

Вілы вострыя на лбе,
Цэлы дзень траву скубе.
Прыйдзе з пашы вечарком
–
Пачастуе малаком.

**5.**

Вуркатлівы ён, вусаты,
Забаўляцца з ім мы рады.
Ходзіць – не парушыць
цішы,
І яго баяцца мышы.

**6.**

На сцяжынцы клубок –
Не адкоціш убок,
А паколеш толькі
Рукі аб іголкі.

**7.**

Пад зямлёй будуе дом
Без сасны і цэглы.
Невідушчым маўчуном
Ён жыве век цэлы.

**8.**

Хто, скажыце зараз мне,
Носіць дом свой на спіне?

**9.**

І скача, і спрытна гарцуе,
І рада зялёнай траве.
Хоць носіць цяльняшку
марскую,
А ў стэпе гарачым жыве.

**10.**

Яна ў бары
Жыве ў нары.
Яркая рыжуха,
Здатная хітруха.

**11.**

Стракаты, крылаты
Руплівец лясны,
Лекар заўзяты
Хворай сасны.

**12.**

Пад аблокі ўзлятае
І прыход вясны вітае –
Льецца спеў высокі, чысты,
Мілагучны, прамяністы.

**13.**

Дзве літары
Умее вымаўляць,
А можа імі
Нас зачараваць.

**14.**

У садах, гаях саліст
Разлівае спеў і свіст.
Як пачне ён свой канцэрт –
Запалоніць цэлы свет.

**15.**

Вось дык хлопцы-малайцы
На дзівосы здатны –
Без сякеры і пілы
Слаўна ўзводзяць хаты.

**16.**

Акрабатачка над намі,
На раўнюткай столі,
Ходзіць, спіць уверх
нагамі,
Не ўпадзе ніколі.

**17.**

Хто ж такі ў асеннім лесе
Між асінак дзвюх,
Сетку белую павесіў,
Каб лавіла мух.

**18.**

У рацэ ныраў, купаўся,
А сухім увесь застаўся.
І пайшоў, загагатаў,
Ласты яркія не зняў.

**19.**

Заплывае ў іл рачны,
Засынае да вясны.

**20.**

Далёка ў акіяне
Жывёліна жыве
І там заўсёды самай
Драпежнаю слыве.

**21.**

Хто апрануў
Сябе і дзетак
У кашулькі
З залатых манетак?

**22.**

Маленькі, крылаты,
Між кветак лятае
І яркім, стракатым
Заўжды выглядае.

**23.**

Востры хвост, нібыта вілы,
Дзіўны выгін маюць
крылы.
Прыляціць да нас калі –
Лепіць дом сабе з зямлі.

**24.**

Хаткі не будуе,
Дзетак не гадуе.

У чужым гняздзе
Яйка пакладзе.
Па лясах лятае
Некага гукае.

**25.**

Спіць зімою да вясны
Соладка жыхар лясны.
Сніць не снег ён і не лёд,
А духмяны, смачны мёд.

## Адгадкі

1.Конь. 2.Авечка. 3.Алень. 4.Карова. 5.Кот. 6.Вожык. 7.Крот. 8.Чарапаха, слімак. 9.Зебра. 10.Лісіца. 11.Дзяцел. 12.Жаваранак. 13.Зязюля. 14.Салавей. 15.Мурашкі. 16.Муха. 17.Павук. 18.Гусак. 19.Карась. 20.Акула. 21.Карп. 22.Матылёк. 23.Ластаўка. 24.Зязюля. 25.Мядзведзь.

## III. Неба, зямля, з’явы прыроды, час

**1.**

Мы ўсе яму рады,
А як жа іначай?
Ды хто паглядзіць на яго –
Той заплача.

**2.**

Праз шкло праходзіць,
Шклу не шкодзіць.

**3.**

Што за вочы?
Вось дык вочы!
У каго і дзе?
Пазірае адно ўночы,
А другое ўдзень.

**4.**

Хоць топчуць яе,
І рэжуць, і б’юць –
Яна не злуе анічуць.
А толькі багаццем
Усім шчодра плаціць.

**5.**

Між лугоў, лясоў удалеч
Стужка сіняя віецца.

І агонь яе не спаліць,
І ніколі не парвецца.

**6.**

Доўгая, шырокая каса
Аж да неба дарасла.

**7.**

Калі з яе мы будзем браць,
Яна вялікай зможа стаць.
А многа ёй калі дадзім,
То нават знікне назусім.

**8.**

Што за дзіва? –
Па вадзе
Дождж
Нагамі ўверх ідзе.

**9.**

На полі цёмным і
бясконцым
Гарох бялюткі ззяе.
А цемру як разгоніць
сонца,
Тады гарох знікае.

**10.**

Ідзе сястра да брата,
А брат знікае з хаты.

**11.**

Крыл не маюць, а лятуць,
Ног не маюць, а бягуць.
Не ў вадзе, але з вадою,
Адгадайце, што такое?

**12.**

То страляла, як з гармат,
То скакала весела,
Каляровую дугу
Між аблок павесіла.

**13.**

Ходзіць па даху,
Па вуліцы, полі.
Ног у яго –
Не палічыш ніколі.

**14.**

Госця ноччу завітала,
Палатна наткала.
Разаслала навакол –
Стаў святочна-белым дол.

**15.**

Без машын
Зімой кладзе
Мост срабрысты
Па вадзе.

**16.**

На горку кліча ён дзяцей
І беліць свет кругом.
Бывае, цэлы дзень ідзе,
А ног няма ў яго.

**17.**

Летняй раніцай павольна
Выплывае ён на луг,
Дыванам світальным,
сонным
Рассцілае белы пух.

**18.**

Прыйшла яна
І спаць усіх паклала,
Накрыла лёгкім
Сінім пакрывалам.

**19.**

Языка не мае,
А крычыць, гукае.
Хоць і гулкае яно,
Ды ніколі не відно.

**20.**

Пачаргова ідуць.
І з далёкіх часоў
Службу часу нясуць
Сем сясцёр і братоў.

**21.**

У бацькі – дванаццаць
Малойцаў-сыноў,
Адвечных рупліўцаў
І шчырых сяброў.

**22.**

У печы нараджаецца,
А ў неба ён спяшаецца.

**23.**

Ненажэра гэты з’есці
Можа ўсё на свеце.
А нап’ецца ён вады –
Памірае ўміг тады.

**24.**

Яе ні ўбачыць, ні пачуць
Нідзе, нікому анічуць.
Яна між вас штодзень
бывае,
А загаворыце – знікае.

**25.**

Я бягу, і ён бяжыць.
Я стаю, і ён стаіць.
Я іду, і ён ідзе,
Аж пакуль не згасне дзень.

## Адгадкі

1.Сонца. 2.Сонечны промень. 3.Месяц і сонца. 4.Зямля. 5.Рака. 6.Дарога. 7.Ямка. 8.Фантан. 9.Зоркі ў небе. 10.Сонца і месяц. 11.Хмары. 12.Навальніца, вясёлка. 13.Дождж. 14.Зіма. 15.Мароз. 16.Снег. 17.Туман. 18.Ноч. 19.Рэха. 20.Дні тыдня. 21.Год і 12 месяцаў. 22.Дым. 23.Агонь. 24.Цішыня. 25.Цень.